Свертывание нэпа во второй половине 20-х годов являлось не актом субъективного самоволия, а закономерным следствием обострения его противоречий, было подготовлено взаимодействием экономических и политико-идеологических причин. К середине 20-х годов четко определилось основное противоречие нэпа: между многообразием экономических отношений, рыночными методами экономики и монополией одной партии. Исходя из политической цели создания социалистической модели экономики, нэп объективно не мог стать законченной системой. Рыночные методы хозяйствования почти повсеместно соседствовали с директивно-командными, переплетались с ними. Окончательное утверждение к концу 20-х годов авторитарно-тоталитарной политической системы неизбежно привело к перерастанию административного начала в традиционную политику и ликвидации хозяйственной системы нэпа.

Таким образом, опыт нэпа учит, что однозначное, полное утверждение рыночной экономики возможно только одновременно с решительной демократизацией политической системы общества. В определенной мере актуально это и для сегодняшней Беларуси, где все еще остаются проблемы с работой Советов депутатов, во взаимоотношениях государства с оппозицией, политическими партиями и общественными организациями, средствами массовой информации.

Таковы наиболее общие уроки переходного периода 20-х годов. Творческое применение их вместе с накопленным мировым опытом преобразований в странах переходного типа развития, безусловно, поможет решить не одну из проблем, стоящих сегодня перед экономикой Беларуси.

Литература

1. БелГазета. 2006. № 5 (6 февраля).
2. Белорусы и рынок. 2006. № 2 (16 января), № 5 (6 февраля), № 8 (27 февраля), № 9 (6 марта).
3. Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т. 44.
4. Несцяровіч М.Б. Рэфармаванне эканомікі Беларусі ў паслясавецкі час // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2005. № 1.
5. Развитие экономики Белоруссии в 1921-1927 гг. – Мн., 1973.
6. Собрание узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского правительства. 1923. № 29.
7. Экономика Советской Белоруссии. 1917-1967. – Мн., 1967.
8. Экономическая газета. 2006. № 2 (6 января), № 19 (7 марта).
9. Экономическая история Беларуси. – Мн., 2004.

## ПОЛЬШЧА ПАД УЛАДАЮ КАМУНІСТАЎ: НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ СУЧАСНАГА АСЭНСАВАННЯ

М. В. Стралец

*Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь*

Пасля таго, як у ліпені 1944 г. на тэрыторыю Польшчы ўвайшлі войскі Чырвонай Арміі, Масква вяла мэтанакіраваную лінію, накіраваную на дасягненне поўнай улады прасавецкіх сіл у гэтай краіне. Размова ішла перш за ўсе пра польскіх камуністаў (ППР).

"Ялцінскія дамоўленасці азначалі, што Польшча станавілася адным з ключавых звенняў савецкай сістэмы бяспекі ў Еўропе, да фарміравання якой Масква прыступіла на заключным этапе вайны. Гэта яе месца было замацавана польска-савецкай дамовай аб сяброўстве, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве, заключанай 21 красавіка 1945 г.

Прынятыя ў Ялце рашэнні ў поўнай меры адпавядалі інтарэсам ППР і яе саюзнікаў.Ім удалося дабіцца міжнароднага прызнання новай улады ў Польшчы, вывесці з гульні правыя сілы лонданскага лагера, умацаваць свае пазіцыі ў краіне. Тым самым былі дасягнуты асноўныя палітычныя мэты, сфармуляваныя ў маніфесце ПКНВ." (1, с. 209).

На ППР істотна працавала тая абставіна, што дзякуючы СССР для пасляваеннай Польшчы сталі рэальнасцю істотнае прырашчэнне тэрыторыі на поўначы і на захадзе, прахажджэнне новай савецка-польскай мяжы на усход ад "лініі Керзона".

Зразумела, ідучы на істотныя уступкі ў тэрытарыяльным пытанні, Масква разлічвала на тое, што Полышча назаўсёды стане часткай знешняй імперыі Крамля. Сталін разглядаў у кантэксце экспарту савецкай мадэлі сацыялізма ў гэту краіну выбары ў заканадаўчы сейм, прызначаныя на 17 студзеня 1947 года. Зараз ўсе сур'ёзныя даследчыкі адзіныя ў тым, што з падачы савецкага кіраўніцтва быў запушчаны механізм фальсіфікацыі вынікаў дадзеных выбараў. Насуперак яго рэальнаму рэйтынгу, так званы дэмакратычны блок, быў абвешчаны пераможцам. У гэтым блоку ключавую ролю адыгрывала ППР. Пэпэраўцы з сваімі саюзнікамі забраніравалі за сабой у парламенце 394 дэпутацкіх месца, а іншыя партыі і аб'яднанні, разам узятыя, - толькі 50. Прычым у якасці непрымірымага праціўніка дэмблока выступалі толькі 28 парламентарыяў, якія прадстаўлялі партыю Польска Строніцтва Людове (ПСЛ). З канца 1947 года ПСЛ пераходзіць да супрацоўніцтва з уладнымі структурамі.

Канешне, ППР дзейнічала ў вельмі жорсткіх рамках, зададзеных Крамлём. Аднак трэба аддаць належнае Генеральнаму сакратару ЦК Уладзіславу Гамулку. У яго быў найбольш рэалістычны адказ на пытанне: «Як трэба будаваць сацыялізм?». У.Гамулка выключаў фарсіраваныя тэмпы, заклікаў улічваць польскую спецыфіку. Зразумела, гэта не падабалася Маскве. Абураў Сталіна і той факт, што генсек ППР не далучыўся да антыюгаслаўскай кампаніі, распачатай «бацькам усіх народаў». Таму Крэмль вырашыў памяняць «апартуніста» У.Гамулку на сталініста Баляслава Берута. Адпрацаваны ў Маскве сцэнарый быў поўнасцю рэалізаваны на Пленуме ЦК ППР, які датуецца 31 жніўня - 3 верасня 1948 года. Новы лідэр ППР Б.Берут адразу стаў укараняць сталінскую мадэль сацыялізму. Яго першы крок у гэтым напрамку — аб'яднанне ППР і ППС у Польскую аб'яднаную рабочую партыю (ПАРП), якое здзейснілася ў снежні 1948 года. З 1948 па 1989гг. ПАРП мела манаполію на ўладу ў ПНР.

Камуністычныя улады з канца 1940-ых гг. зрабілі акцэнт перш за ўсё на цяжкую прамысловасць, што ніяк не стыкавалася з унутрыпольскімі рэаліямі. Парушаючы аб'ектыўныя эканамічныя законы, Берут і К* не адказвалі на наступнае пытанне: як яны могуць хутка кампенсаваць відавочны недахоп сыравіны, прапанаваць адэкватны фарсіраванаму развіццю дадзенай галіны палiйна-энэргетычны баланс пры дэфіцыце адпаведных рэсурсаў? Падобная палітыка моцна біла па інтарэсах польскага сялянства, прывяла да глыбокага крызісу ў сферы сельгасвытворчасці. Вялікае абурэнне працаўнікоў вёскі выклікала прымусовая калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Берутаўскі рэжым кінуў за краты без малага 150 тысяч грамадзян ПНР. Камуністычныя улады ацэньвалі гэтых суайчыннікаў як ворагаў сацыялізму.

XX з'езд КПСС (люты 1956 года) выкрыў культ асобы І.В.Сталіна і тым самым пазбавіў Б.Берута яго казырной карты. Рэальнасцю тагачаснай Польшчы стаў моцны антыаўтарытарны рух, які знайшоў сваю кульмінацыю ў Познаньскім паўстанні (1956г.). Паўстанне мела шырокі рэзананс унутры краіны. Многія палякі былі салідарныя з паўстаўшымі ў тым, што уладам трэба кардынальна мяняць эканамічную

палітыку, што неабходна вярнуцца да тых свабодных выбараў, якія існавалі да ўсталявання камуністычнага рэжыма, што савецкая вайсковая прысутнасць супярэчыць нацыянальным інтарэсам Польшчы.

Безумоўна, сілы паміж уладамі і паўстаўшымі былі няроўнымі. Афіцыйная Варшава прыбегла да сілавога аргумента і паўстанне пацярпела паражэнне. Заўважым, што ў вышэйшых эшалонах не прасочваўся агульны назоўнік у прагназаванні уплыву познаньскіх падзей на грамадзянскую свядомасць палякаў. У корпусе ключавых функцыянераў ПАРП выразна абазначыліся дзьве фракцыі: «пулавяне» і «натолінцы». Першая фракцыя бачыла галоўны ўрок паўстання ў тым, што трэба ажыццяўляць ліберальны курс і адпаведна рэфармаваць розныя сферы грамадскага жыцця. «Натолінцы» думалі катэгорыямі берутаўскай эры. Яны жорстка зацыкліліся на тым, каб не дапускаць аніякага іншадумства, кідаць не згодных з рэжымам за краты. У гэты няпросты час пераемнік Б.Берута на пасадзе галоўнага кіраўніка ПАРП Э.Охаб, кіраўнік вышэйшага органа выканаўчай улады Ю.Цыранкевіч выказваліся асцярожна, туманна, не выступалі з прынцыповых, самастойных пазіцый. Таму рэйтынг гэтых дзеячоў сярод суайчыннікаў быў нізкі. Імі была запатрабавана выдатная асоба, здольная ажыццявіць дэсталінізацыю, рэалізаваць на практыцы польскі шлях да сацыялізму. У гэтай сувязі ў вачах палякаў альтэрнатывы для кандыдатуры Уладзіслава Гамулкі для пасады кіраўніка ПАРП не было. Дадзеная кандыдатура была ва ўсіх на слыху з нагоды маючага адбыцца VIII кастрычніцкага (1956г.) пленума ЦК ПАРП. М.Хрушчоў не хацеў бачыць У.Гамулку польскім лідэрам. Ён робіць ход, які ніхто з аглядальнікаў не прагназаваў: накіроўваецца ў сталіцу ПНР, дае загад савецкім вайскоўцам, дыслацыраваным у Польшчы, прадэманстраваць прыхільнікам У.Гамулкі ў Палітбюро ЦК ПАРП наяўнасць у савецкага лідэра сілавога аргумента, набліжаючыся да Варшавы. Ход Першага сакратара ЦК КПСС не спрацаваў. Галоўны вынік Пленума — новы старт У.Гамулкі на вышэйшым прыступку партыйнай лесвіцы. З пастановы Пленума вынікала, што Гамулка неўзабаве будзе працаваць з новым Міністрам абароны. Партыйны форум вырашыў, што Маршал Савецкага Саюза, Маршал Польшчы Канстанцін Ракасоўскі не павінен больш быць членам Палітбюро ЦК ПАРП.

Да задавальнення ліберальна настроенай часткі палякаў «сталініст» К.Ракасоўскі праз непрацяглы прамежак часу перастане узначальваць ваеннае ведамства і вернецца ў Савецкі Саюз.

У заслугу У.Гамулку можна паставіць частковую дэсталінізацыю, унясенне карэктыў у галіне унутранай палітыкі. Было пашырана кола пытанняў, якія суб'екты гаспадарання маглі вырашаць самастойна. Прасочвалася імкненне цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання пераадолець перакос у суадносінах паміж вытворчасцю сродкаў вытворчасці і вытворчасцю прадметаў спажывання. Уладныя структуры не рабілі болей ужо такі жорсткі акцэнт на развіццё цяжкай прамысловасці, як у эру Б.Берута. Набывала рэальныя абрысы дэкалектывізацыя сельскай гаспадаркі і рэзка ўзрасла доля індывідуальных сельгасвытворцаў у аграрнай сферы. Больш ліберальнай стала палітыка ў адносінах да СМІ, на свабодзе апынуліся кінутыя за краты праціўнікі сталінскай мадэлі сацыялізма, быў пакладзены канец уседазволенасці польскіх чэкістаў. Разам з тым У.Гамулка і яго атачэнне не адмовіліся ад многіх рэцэптаў вырашэння пытанняў дзяржаўнай важнасці, якія упершыню атрымалі апрабацыю ў часы кіравання «бацькі ўсіх народаў».

Эра У.Гамулкі ў польскай гісторыі скончылася ў 1970 годзе. Яе фінал адбываўся на дрэннай ноце. Распачаўся другі пасля 1956 года крызіс. Пасля таго як забунтавалі рабочыя ў Гданьску, хваля грамадскага незадавальнення ахапіла ўсю краіну. Пераемнікам У.Гамулкі на пасадзе кіраўніка партыі становіцца Эдвард Герэк. Новы польскі лідэр вельмі актыўна звяртаўся да іншаземных заімадаўцаў. Пэўны час з пункту гледжання макраэканамічных паказчыкаў здавалася, што Э.Герэк абраў правільны курс. Аднак выкананне польскім бокам умоў, на якіх прадстаўляліся займы, моцна біла па кішэні падаткаплацельшчыкаў. Таму сярэднестатыстычны паляк адмоўна ўспрымаў палітыку улад, лічыў натуральным адказам на антынародны курс ПАРП забастоўкі, дэманстрацыі. З сярэдзіны 1970-ых гадоў такі адказ становіцца тыповай з'явай унутрапольскай рэчаіснасці. Бездапаможная улада ўсё актыўней прыбягала да рэпрэсій супраць рабочых. Адначасова яна прапісала ў Асноўным Законе новыя антыдэмакратычныя моманты, што яшчэ больш павысіла градус грамадскага незадавальнення. У другой палове 1970-ых гг. упершыню ў гісторыі антыаўтарытарнага руху ў сацыялістычнай Польшчы выразна акрэслілася структураваная апазіцыя. З 1976 года распачынаецца гісторыя Камітэта абароны рабочых, з 1977 года — Руху ў абарону правоў чалавека і грамадзяніна. Высокую грамадзянскую свядомасць прадэманстравалі ключавыя дзеячы каталіцкай царквы. Ім надаў дадатковыя сілы той факт, што з 1978 года пачаўся адлік пантыфіката кракавяніна Караля Вайтылы ( Іаана Паўла ІІ ). Суайчыннікі ўпершыню ўбачылі яго на радзіме ў такой якасці ў 1979 годзе. Антытаталітарныя, антыаўтарытарныя, антыкамуністычныя перакананні кіраўніка Рымска-каталіцкай царквы ўспрымаліся ў польскім грамадстве як перакананні вялікага маральнага аўтарытэта, выдатнага мысліцеля, сумлення польскай нацыі.

Адмоўныя з'явы ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны знайшлі свайго апагея ў 1980 годзе. Менавіта тады распачаўся трэці, самы глыбокі крызіс у ПНР. Польшча павінна была сваім заімадаўцам 20 млрд. даляраў. Зноў старт антыаўтарытарнаму руху далі нязгодныя з рэжымам рабочыя Гданьска. У ходзе забастовак на Балтыйскім узбярэжжы актыўна вылучаўся гданьскі электрык Лех Валенса. Менавіта ён пакладзе пачатак стварэнню агульнапольскага незалежнага прафсаюза «Салідарнасць», надоўга узначаліць гэту арганізацыю.

"Салідарнасць" з самага пачатку была пераважна грамадска-палітычным, а не прафсаюзным рухам, які аб'ядноўваў разнастайныя сілы. Яна вырастала на хвалі рабочага пратэсту, і ў першы час не мела выразных планаў далейшага развіцця краіны. Боязнь перад савецкай інтэрвенцыяй прымусіла інтэлектуальны штаб руху выступіць з канцэпцыяй "самарэгулявальнай рэвалюцыі." Яна прадугледжвала, што Польшча, застаючыся удзельнікам савецкага ваенна-палітычнага блоку, адначасова павінна імкнуцца да ўнутранага пераўтварэння грамадска-палітычнага ладу: палітычнаму плюралізму, усталяванню грамадскага кантролю за дзейнасцю дзяржавы, забеспячэнню незалежнасці грамадскіх і дзяржаўных інстытутаў ад ПАРП." (1, с.220)

Сацыяльна-палітычны антаганізм у грамадстве рэзка нарастаў. Сістэмны крызіс прымусіў Э.Герэка ўйсці ў адстаўку. Новы лідэр ПАРП Станіслаў Каня аказаўся слабай постаццю для вырашэння задач, якія паўсталі перад краінай. У 1981 годзе яго мяняе на дадзенай пасадзе генерал Войцэх Ярузельскі. Ён атрымаў даставерную інфармацыю аб тым, што Масква рыхтуе ваенную інтэрвенцыю ў Польшчу. Крамлю яўна хацелася паўтарыць вопыт падаўлення пражскай вясны. У Ярузельскага быў толькі адзін спосаб прадухілення рэалізацыі планаў савецкага кіраўніцтва: зрабіць рэальнасцю ваеннае становішча. 13 снежня 1981 года пад яго падводзіцца прававы базіс. Ваеннае становішча

дзейнічала па 1983 год. Ва унутрапольскім плане яно мела перш за ўсё адмоўныя наступствы, па сутнасці павялічваючы глыбіню грамадскіх супярэчнасцяў. Кіраўнік партыі, вышэйшая службовая асоба ў сістэме дзяржаўнага кіравання Войцэх Ярузельскі атрымаў большую ступень свабоды пасля таго, як у СССР да ўлады прыйшоў М.С.Гарбачоў. Абвешчанае ім новае палітычнае мысленне меркавала свабоду выбара, што з'явілася моцным штуршком для антыаўтарытарных сіл у Польшчы.

Натуральна, зараз мы падыходзім да разбору лёсавызначальных падзей у бліжэйшай суседкі.

Сапраўды пераломным быў Пленум ЦК ПАРП, які адбыўся ў снежні 1988 — студзені 1989гг. Галоўны вынік пленума — згода камуністычных уладаў на правядзенне круглага стала, які адбыўся ўвесну 1989г. Удзельнікі круглага стала былі дэлегаваны ад цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання, ПАРП, грамадскіх арганізацый, Касцёлу, «Салідарнасці», Усепольскага пагаднення прафсаюзаў. Была выпрацана складаная, але ў той жа час спрыяльная для апазіцыі формула выбараў у сейм: 60% на 40%. 60% дэпутацкіх месцаў павінны былі заняць прадстаўнікі ПАРП, Аб'яднанай сялянскай партыі (АСП) і «Строніцтва дэмакратычнага» (СД), 40% - іншыя сілы. Чэрвеньскія (1989г.) выбары ў сейм сталі відавочным поспехам для апанентаў камуністычнага рэжыма. Неўзабаве пасля выбараў адбылася перагрупіроўка сіл, якая ўнесла кардынальныя змены на капітанскім мосціку польскай палітыцы. Сталі супрацьстаяць адзін да аднаго два блокі: першы блок («Салідарнасць», АСП, СД) і другі блок (ПАРП). Менавіта першы блок узяў на сябе з канца жніўня 1989г. урадавую адказнасць. У Польшчы быў створаны першы ў пасляваеннай гісторыі Усходняй Еўропы некамуністычны урад, які ўзначаліў вядомы дзеяч «Салідарнасці» Тадэвуш Мазавецкі.

Такія некаторыя аспекты сучаснага асэнсавання таго перыяду ў гісторыі Польшчы, калі яна знаходзілася пад уладаю камуністаў.

Литература

1. История южных и западных славян: В 2 т.: Учебник. Т. 2: Новейшее время / Под ред. Г. Ф. Матвеева, З. С. Ненашевой. – М.: Издательство МГУ, 1998.

## СТОЛЫПИНСКАЯ АГРАРНАЯ РЕФОРМА: ПОПЫТКА «ТИХОЙ РЕВОЛЮЦИИ».

Н.Н.Ковалёва

*Брестский государственный технический университет, г. Брест, Беларусь*

Сто лет назад, 9 ноября 1906 года премьер-министром Петром Аркадьевичем Столыпиным был издан исторический указ, освободивший крестьян от власти общины и положивший начало реализации аграрной реформы в России. Необходимость перемен в стране была очевидна: о кризисном положении страны свидетельствовало как поражение в русско-японской войне, так и революционный взрыв 1905-1907гг. Причем решение аграрного вопроса представлялось первоочередной задачей ввиду того, что с аграрным сектором экономики было связано более 4/5 населения страны и ввиду наличия множества проблем, нерешенных реформой 1861 года.

Заметим, что аграрный вопрос был в центре внимания различных политических сил, поэтому попытка Столыпина найти оптимальное решение вопроса не могла не привлечь внимание к его персоне со стороны революционеров. «Проведением хуторской реформы, где каждый крестьянин становился сам маленьким помещиком, уничтожалась партия социал-революционеров. Поэтому понятно их стремление остановить реформу...», - писала дочь Столыпина. До его трагической гибели в 1911 году на